# Фф

Фф











ф





ф






фа
фо
фэ
фу
фы
фі
фя
фю
фе
фё



фанта́н



фо́рма



футбо́л



куфэ́рак



фе́я



фія́лка

дама
смарт — ФОН
тэле

| | | |
|---|---|---|
| фру́кты | флаг | фу́тра |
| садаві́на | сцяг | шу́ба |

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

фо́кус фо́кусы фо́кусні́к

фігу́рны фігуры́ст фігуры́стка

фо́та фато́граф фатагра́фія

## Фігуры́сты



Мы ката́емся на лёдзе
І адны́, і ў караго́дзе.

Уладзімір Мацвеенка.

## Фато́граф



На ла́ўцы ца́цкі се́лі ў рад.
Бяру́ я фо́-та-а-па-ра́т.
Усі́м смяя́цца прапану́ю.
Ува́га, я фа-та-гра-фу́-ю!

Ніна Галіноўская.

?

Ці ве́даеш ты, кім пацу́юць бацькі́? Чым яны́ займа́юцца? Будаўні́к, прадаве́ц, наста́ўнік, музыка́нт, маста́к, журналі́ст, праграмі́ст, шафёр, фато́граф, футбалі́ст, фігуры́ст, фо́куснік…

Любы́ заня́так ціка́вы. Усе́ прафе́сіі ва́жныя. Якую́ прафе́сію абра́ць? Ці ёсць у цябе́ ма́ра?

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж д ф



Правообладатель Академия образования

фла      га      жы      фа      ка

мін      ра      ра      ра      фэ

## Дапамажы́ Жэ́ўжыку рашы́ць зада́чу!

Сябры́ Фаі́на, Фе́дзя і Анфі́са — аднаго́дкі.
Дзень нараджэ́ння Фаі́ны ў сакавіку́.
Дзень нараджэ́ння Фе́дзі ў сне́жні.
Дзень нараджэ́ння Анфі́сы ў сту́дзені.




Хто з сябро́ў старэ́йшы?
Хто мало́дшы?
Хто старэ́йшы за Фаі́ну?
Хто мало́дшы за яе́?







— Віншу́ю цябе́ з днём нараджэ́ння!
Жада́ю табе́ по́спехаў у вучо́бе!
— Дзя́куй вялі́кі! Часту́йся, калі́ ла́ска!

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

## «Сало́дкія» фа́брыкі на́шай краі́ны

У Белару́сі шмат заво́даў і фа́брык. Усі́м до́бра вядо́мы «сало́дкія» фа́брыкі на́шай краі́ны. Тут ро́бяць ро́зныя ласу́нкі.

У Мі́нску ёсць фа́брыкі «Камуна́рка» і «Сло́дыч». Там вырабля́юць цуке́ркі, суфле́, шакала́д, пяку́ць пячэ́нне, ва́флі.



У Го́мелі ёсць фа́брыка «Спарта́к». Яна́ вядо́ма шакала́дам, караме́ллю, то́ртамі, пячэ́ннем і піро́жнымі.

Мармела́д, зефі́р, пасцілу́, халву́, іры́с вырабля́юць у Бабру́йску і Наро́ўлі.

Сма́чныя вы́рабы белару́скіх фа́брык заўсёды на стале́.



Даве́дайся, які́я фа́брыкі і заво́ды ёсць у тваі́м ро́дным кра́і. Лю́дзі які́х прафе́сій там працу́юць?

к й я ю е ё з в б ц ь ш х ж д ф



Правообладатель Академия образования